Рэспубліканскі сеткавы праект “Апорная метадычная пляцоўка – прафесійнай супольнасці”

Напрамак “Гісторыка-культурнае выхаванне”

Тэма апорнай метадычнай пляцоўкі “Выхаванне асобы на аснове культурна-гістарычнай спадчыны регіёна”

# Выхаваўча-адукацыйная роля музея “Гісторыя Заронаўскага краю” ў фарміраванні любові да сваёй Бацькаўшчыны

*Нікіціна Людміла Канстанцінаўна, педагог дадатковай адукацыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр дзяцей і моладзі Віцебскага раёна”*

**Анатацыя.** Цэнтр дзяцей і моладзі Віцебскага раёна з’яўляецца каардынатарам культурна-гістарычнай, краязнаўчай, музейнай дзейнасці ў рэгіёне. У Цэнтры створаны ўмовы для выхавання асобы навучэнца як грамадзяніна і патрыёта сваей Радзімы. Далучэнне дзяцей да вывучэння роднага краю, гісторыка-культурнай спадчыны, фарміраванне пачуцця павагі да родных мясцін і сваёй Радзімы – галоўны вектар ў гэтым напрамку. У дадзеным артыкуле прадстаўлены вопыт работы народнага музея “Гісторыя Заронаўскага краю”, шырока вядомага за межамі раёна. За шмат гадоў дзейнасці музея выхавалася не адно пакаленне добрасумленных юных грамадзян.



Фота 1. Народны музей "Гісторыя Заронаўскага краю"

***Даведка.*** Музей “Гісторыя Заронаўскага краю” створаны ў 1986 годзе на базе мясцовай школы. У 1996 годзе яму прысвоена званне “Народны музей”. Музей з’яўляецца культурна-адукацыйным і выхаваўчым цэнтрам не толькі вёскі Заронава, але і для ўстаноў адукацыі Віцебскага раёна У музеі дзейнічае 8 тэматычных залаў. На яго базе працуюць два аб’яднанні па інтарэсах “Юныя экскурсаводы” і “Краязнаўцы”, у якіх займаюцца дзеці ад 6 да 16 гадоў.

Кіраўнік музея - Нікіціна Людміла Канстанцінаўна, педагог дадатковай адукацыі Цэнтра дзяцей і моладзі Віцебскага раёна, знакаміты краязнаўца, больш за 40 гадоў займаецца музейнай дзейнасцю. Пад яе кіраўніцтвам музей не проста павялічыўся ў памерах, але і стаў вядомым далёка за межамі Беларусі. За шматгадовую плённую працу ўзнагароджана нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Выдатнік адукацыі”, медалямі

Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, шматлікімі граматамі, з'яўляецаа лаўрэатам звання "Чалавек года Віцебшчыны" ў намінацыі "Адукацыя і культура".

Музей штогод наведвае больш дзвюх тысяч чалавек. Геаграфія наведвальнікаў шырокая: Расія, Італія, Венесуэла, Шры-Ланка. Германія, Кітай, Славенія, амаль усе краіны былога СССР. Запрашаем наведаць Заронаўскі музей, экскурс да якога склала Людміла Канстанцінаўна Нікіціна.

**Першая зала – "Беларуская этнаграфія"**


Фота 2. Этнаграфічная зала

У першай зале этнаграфічнай
Многія рэчы ўжо непрывычныя.
Тут ёсць печка, куфар, лавы,
Дываны ды бёрдаў пары,
Ручнікі ёсць ды трапач, цэп і ступа, і гарлач,
Вышываныя сурвэткі, вязаныя шкарпэткі.
Сюды экспанаты прывозілі дзеці,
Што ў вёсках яны ў бабуляў знайшлі
У куфры, у пуні, у хляве, на гарышчы
і нават у зямлі. І вось цяпер гэтыя лыжкі і лапці,
Кашулі, збаны, ручнікі - іх на паліцы ў парадку паставілі,
Каб расказваць людзям пра побыт былы.

**Другая зала – "Гісторыя Заронаўскага краю»**



Чырвонай ніткай тут вайна Айчынная.
Вось госці з Украіны і Літвы,
З Арменіі, Расіі, Казахстана
Ўбачылі, як памяць беражом мы
Пра іх загінуўшых сыноў старанна.
Мы вам раскажам пра герояў:
Крылова, Крывахіжына, Хахлова,
Гагарына, Надымава, Дэрэка.
Вярнулі з небыцця не аднаго мы чалавека.

**Трэцяя зала – "Вяртанне ў Савецкі Саюз"**



Хочаш вярнуцца ў СССР,
Пойдзем у трэцюю залу цяпер.
Глянем на быт у савецкі час—
Шафа з адзеннем, трыльяж,
Стол круглы, саквяж.
Боты, шынель, партупея—
Арміі нашай адзенне.
"Спідола", "Рэкорд", статуэтка,
"Зінгер", прасы, этажэрка.
Рэчаў усякіх тут мноства: Агледзець усе ня проста.

**Чацвёртая зала – “Калекцыйная”**

Наступная зала калекцыйная -
Найбольш эмацыйная,
Бо тут калекцый сабрана багата,
Ад лялькі да фотаапарата.
Гадзіннікі, значкі, самавары,
Календары, ручкі, лапцей пары,
Ёсць тут грошы, бутэлькі і маркі.
Рогі  і навагоднія цацкі,
Самалёцікі ўверсе лятаюць,
Наведвальнікі тут адпачываюць.



**Пятая зала – “Хата-чытальня”**

Пятая зала музея - хата-чытальня,
Для шматлікіх гасцей вітальня:
Тут працуем, гарбату п’ём,
Калі па тэме, то й пяём.
Багаты край наш на падзеі,
І мы не трацім шчэ надзеі
Пабыць, убачыць, запісаць,
Каб было што ўспамінаць.



Фота 6. Хата-чытальня

**Шостая зала – “Міфалагічная”**

Вельмі здзівім зараз вас залай незвычайнай:
Пасялілася ў нас нечысць  віртуальная:
Аржавень, Балотнік, Багнік, Вірнік, Лознік,
Вадзянік, Дамавы, Ягіня, Вогнік,
Ёсць Падпечнік, Лесавік,
Жыжаль, Зюзя, Пушчавік. Шмат яшчэ
цікавых  з’яў і міфічных там праяў
Мы вам з радасцю раскажам
А таксама і пакажам.



Фота 7. Міфалагічная зала

**Сёмая зала – “Паветка”**

Паветка - невялікі хлявок,
Дзе вы ўбачыце санкі, саначкі, вазок.
Ёсць бязмен, сячкарня ў нас,
Ёсць саха, плужок і прас,
Паляўнічага куток, пчаляра, пажарніка,
Кола трактара, хамут,
Дошка першакласніка.
Незвычайная лавушка,
Барана ды валакушка.



Фота 8. Паветка

**Восьмая зала – “Партызанская зямлянка”**

У восьмай зале музея – партызанскай зямлянцы – размешчаны прадметы побыту перыяду Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўленыя жыхарамі вёскі ці знойдзеныя краязнаўцамі.



## Праектная дзейнасць

У практыцы работы музея актыўна выкарыстоўваецца праектная тэхналогія па распрацоўцы і рэалізацыі пошукава-даследчых і сацыяльна значымых праектаў, заснаваных на шырокім выкарыстанні патэнцыялу рэгіёна ў фарміраванні грамадзянскасці і патрыятызму дзяцей і моладзі праз далучэнне да гістарычнага мінулага і культурнай спадчыны нашай краіны і роднага краю, актыўнае ўключэнне ў даследчую і грамадска карысную дзейнасць, заснаваную на пераемнасці гісторыка-культурнага вопыту пакаленняў, пашырэнне магчымасцей удзелу ў грамадскім і культурным жыцці рэгіёна.

**Праект “Заронава помніць”**

У гэтым годзе святкуецца 80-годдзе са дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета загінула шмат воінаў, асабліва, калі тут стаяў фронт – са снежня 1943 да лютага 1944 года. Увекавечана памяць больш 12 тысяч байцоў-чырвонаармейцаў. Гэта - вялікі мемарыял у вёсцы Заронава, 10 воінскіх пахаванняў, памятны знак лётчыкам. Юныя краязнаўцы вядуць актыўную пошукавую дзейнасць, займаюцца добраўпарадкаваннем мемарыялу, воінскіх пахаванняў, помнікаў героям.

Музей “Гісторыя Заронаўскага краю” пры падтрымцы Заронаўскага сельскага выканаўчага камітэта рэалізавалі праект “Заронава помніць”. Над гэтым праектам працавалі на працягу дзесяці гадоў, каб увекавечыць памяць землякоў, якія загінулі на вайне, і ветэранаў, што прайшлі дарогамі вайны, аднаўлялі край у пасляваенны час. У рамках праекта за сродкі бацькоў, мясцовых жыхароў быў устаноўлены помнік Брыкавым, Івану Іванавічу і Аляксандры Ільінічне - ветэранам вайны, якія былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі. Так сталася, што іх дзеці жывуць далёка ў Расіі, не могуць штогод прыязджаць на магілу бацькоў. Вось і вырашылі ўсе разам увекавечыць памяць славутых сваіх землякоў.



У 2024 годзе Заронаўскаму краю споўнілася 100 гадоў. Заронаўскі сельсавет вырашыў юбілейную дату адзначыць усталяваннем памятнага знака ў гонар мясцовых людзей, у лёс якіх умяшалася вайна. А калектыў музея выдаў кнігу “Заронава помніць”.



Фота 11. Юныя экскурсаводы падчас святкавання 100-годдзя сельсавета

Падчас святкавання 100-годдзя юныя заронаўцы прадставілі ўсе аб’екты сацкультбыту ў фатаграфіях і музейных прадметах.

**Праект “Музей у чамадане”**

Краязнаўства - шырокае поле для пазнання свету, для вывучэння гісторыі краю, сям’і. І гэта дзеці робяць праз напісанне радаводаў сям’і, летапісаў аб’ектаў сацыяльна-культурнага назначэння: магазіна, пошты, школы, дзіцячага сада, ФАПа, клуба, бібліятэкі, пошук экспанатаў, пра якія потым расказваюць на мерапрыемствах.



Фота 12. Юныя экскурсаводы музея на выязным мерапрыемстве

Так стварыўся праект “Музей у чамадане”. Праз гісторыю экспанатаў юныя краязнаўцы раяспавядалі пра свой край, яго гісторыю, легеды і паданні. Такі “выязны” міні-музей вельмі спадабаўся жыхарам і дзецям не толькі вёскі Заронава, але і ўсяго раёна.

**Праект “Музейны дыліжанс на колах часу”**

Працягам праекта “Музей у чамадане” стаў праект “Музейны дыліжанс”. Афармлены пад музейны пакой школьны аўтобус наведаў шмат населеных пунктаў Віцебскага раёна і горада Віцебска. Юныя экскурсаводы расказвалі пра ваенныя падзеі, жыццё і побыт салдат і мясцовых жыхароў у гады вайны, подзвігі герояў і, ў цэлым - пра гісторыю і культуру Прыдзвінскага краю.



Фота 13. Удзельнікі музейнага дыліжансу

**Праект “Святкуем разам”**

Вывучэнне і правядзенне народных святаў і абрадаў беларусаў таксама станоўча ўздзейнічае на фарміраванне асобы. На працягу трох гадоў музей супрацоўнічае з



Цэнтрам нацыянальных культур г.Віцебска. На базе музея сумесна з работнікамі культуры праводзяцца ўсе святы народнага календара. Пачынаецца святкаванне з зімовага цыкла. Такія народныя святы, як Каляда, Вадохрышча, музей праводзіць разам з замежнымі студэнтамі, што навучаюцца ў Віцебску. Дзеці радуюцца, што паказалі сваё дзейства, а госці весела ўспрымаюць святочныя гульні і відэа-фота адпраўляюць сабе на радзіму. Вось так папулярызуецца сваё, беларускае.

Фота 14. Калядныя вячоркі з кітайскімі студэнтамі

Вясеннія святы - Гуканне вясны, Саракі, Камаедзіца - пашыраюць веды дзяцей пра абрады, яны даведваюцца больш пра птушак, якія гняздуюцца ў Беларусі. Для многіх дзіва, што мядзведзь для нас, беларусаў, - татэмная жывёліна. Сярод летніх святаў усім вядома Купалле. А вось як святкуюць усе тры Спаса, дзеці вывучаюць і самі паказваюць для гасцей Заронава і месцічаў. Восеньскі Пакроў святкуецца кожны год. Забытая “Жаніцьба коміна” праводзіцца вясной або восенню.

Падчас падрыхтоўкі і правядзення народных святаў дзеці ўпершыню пачынаюць асэнсоўваць сваё дачыненне да ўсяго, што адбываецца навокал, а словы Радзіма, родны кут, любоў да Айчыны, подзвіг, патрыятызм напаўняюцца новым сэнсам. Работа з гістарычным матэрыялам, які раскрывае традыцыі беларускага народа, гераічную барацьбу, подзвігі, таленты лепшых сыноў краіны, дае мажлівасць адчуць сваю далучанасць да Бацькаўшчыны.

Усведамленне сваёй нацыянальнай годнасці прыходзіць з узростам. Каб нашым вучням гэта ўсведамленне прыйшло, на прыкладах дарослых мы паказваем дзецям праяўленне патрыятызму. Сярод нас жывуць творчыя людзі, якія ў сваіх творах праслаўляюць сваю маленькую радзіму, нашу Беларусь. Выпускніца мясцовай школы Любоў Нікіфарава пакінула ў спадчыну песні, вершы пра сваю Бацькаўшчыну, якія выкарыстоўваюцца амаль на ўсіх мерапрыемствах.

Выхаванне павагі да свайго краю і сям’і пачынаецца з дзяцінства. Заняткі праводзяцца ў музейным класе дзіцячага садка, а найбольш эмацыйныя моманты адбываюцца, калі дзеці прыходзяць у музей, “да Канстанцінаўны”. Тут яны знаёмяцца не толькі з музейнымі прадметамі, а чуюць пра сваіх бабуль-дзядуль, пра сваіх бацькоў. Вельмі запамінальна, калі гэту інфармацыю яны чуюць ад сваіх старэйшых брата ці сястры, юных экскурсаводаў.



Фота 15. Занятак па тэме “Рушнік”

## Пошукава-даследчая праца юных краязнаўцаў

Заронаўскімі краязнаўцамі даследуюцца амаль усе пытанні жыцця краю. Пошукавая праца музея дае шматлікія шляхі для даследвання. Так

установлены карціны жыцця Заронава ў перыяд акупацыі, знойдзена інфармацыя пра паўстанне паліцэйскіх, пра расстрэл мірных жыхароў у в.Палойнікі, пра выратаванне ад жахлівай смерці жыхароў в.Тапорына. Да музея звяртаюцца месцічы за дапамогай у напісанні радаводаў, хочуць ведаць пра лёс сваіх продкаў. Тэмы, якія даследавалі юныя краязнаўцы: “Тапаніміка Заронаўскага краю”, “Рэкі, азёры і крынічкі нашай мясцовасці”, “Пад белымі крыламі - Заронаўшчына (буслы і буслянкі)”, “Еўфрасіння Полацкая ў Заронава” (пра перанос мошчаў святой), “Вучоныя Заронаўскага краю”, “Школьная адукацыя ў XIX - першай палове XX ст. у Заронаўскім краі”, “Ф.Махноў - велікан з Касцюкоў”, “Любоў Нікіфарава – паэтка-песенніца”, “Легенды і паданні Заронаўшчыны” і шмат яшчэ цікавых накірункаў.



Фота 16. Выступленне на раённым свяце “100 год Віцебскаму раёну” у аг. Ноўка

Напрацаваныя матэрыялы выкарыстоўваюцца ў шматлікіх конкурсах, на канферэнцыях і падчас экскурсій па музею. Юныя заронаўцы паказваюць сваё майстэрства ў ролі экскурсаводаў, у веданні гісторыі краю на раённых і абласных мерапрыемствах, прымаюць актыўны ўдзел у конкурсным руху і ў даследчай дзейнасці. Так, у мінулым годзе краязнаўцы занялі I і III месцы ў рэспубліканскім конкурсе юных экскурсаводаў. Актыўна ў конкурсах удзельнічаюць і педагогі дадатковай адукацыі Нікіцін Станіслаў Пятровіч і Нікіціна Людміла Канстанцінаўна. Дыпломы абласнога і рэспубліканскага кшалту ганарова дэманструюцца наведвальнікам.



Фота 17. “Сямейнае свята “Гулі ў бабулі”

Каб зробленае не згубілася з часам, трэба выдаваць кніжкі. Напісанае застаецца. Намі выдадзена брашура “Любоў і боль майго Заронава”, кніга памяці “Успомнім усіх паіменна” са спісам загінуўшых у Заронаўскім сельсавеце. Да 30-годдзя музея свет пабачылі яшчэ дзве кнігі: А.Я.Гушчанка “З гісторыі Заронаўскай школы” і кніга Л.Нікіцінай “Мой любы край, маё Заронава”. Яшчэ стварылі 20-хвілінны фільм “Наша Заронава”, праглядзелі яго маль 15 тысяч карыстальнікаў Інтэрнэту.Усё гэта - для моладзі, каб яны правільна ацанілі мінулае і смела стваралі будучае.

Любіць Радзіму - гэта ганарыцца сваім народам, сваёй гісторыяй, сваёй спадчынай. Адметна, што навучэнцы-краязнаўцы, праносячы ў душы любоў да роднага краю, мараць працаваць на роднай зямлі,

паступаюць вучыцца ў навучальныя ўстановы і потым вяртаюцца на радзіму.

Народны комплексны музей “Гісторыя Заронаўскага краю” сапраўды стаў цэнтрам адукацыі, культуры, гісторыі не толькі для жыхароў Заронаўшчыны, гэта цэнтр прыцягнення для ўсіх, хто любіць і паважае свой родны край.

*Віртуальная экскурсія*
*па залах музея*
музея